Чэрвень 2024

## Кантрольная работа (дыктант)
## для правядзення ўступных іспытаў пры прыёме асоб у VIII клас
## для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў кадэцкіх
## вучылішчах па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»

### Каля моста

З аднаго боку моста берагі рэчкі крутыя і высокія. Але падымаюцца яны не ад самай вады, а воддаль, утвараючы пойму, пасярэдзіне якой і цячэ гэтая невялікая рэчка. Толькі дзесьці на паваротах яна падмывае то адзін, то другі абрыў, вымываючы з зямлі тоўстае карэнне.

Некалі тут стаяў лес. Яшчэ і цяпер на адным беразе захаваліся некалькі па-майстэрску створаных прыродай дубоў. Нібы асілкі, глядзяць яны ўдалячынь, упарта не жадаючы скарыцца старасці. Цёмна-карычневыя лісты на іх палахліва трапечуцца, не ападаючы аж да самай вясны, пакуль не падыходзіць час саступіць месца новым.

З другога боку моста пачынаецца заліўны луг. Цягнецца ён далёка ў бок лесу, што віднеецца за які дзясятак кіламетраў. (109 слоў)

*Паводле Р. Сабаленкі*